У СВАЁЙ АКРУЗЕ

# «ЛЮДЗЯМ ПАТРЭБНЫ НЕ СЛОВЫ, А СПРАВЫ»

## Уладзімір КАЛЕСНІКОВІЧ — аб тым, якім павінен быць сапраўдны дэпутат

Ён нарадзіўся і вырас на Піншчыне. Таму ведае тут кожны метр, кожную вёску. Яго Пінская сельская выбарчая акруга № 15 ахоплівае ўвесь раён — ад аддаленых вёсак да гарадскіх шматпавярховікаў. Пра асаблівасці акругі, звароты выбаршчыкаў, дэпутацкія прынцыпы — у інтэрв'ю з членам Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Уладзімірам Калесніковічам.



### «МАЯ АКРУГА — ГЭТА МАЯ МАЛАЯ РАДЗІМА»

***— Уладзімір Уладзіміравіч, за час дэпутацтва вы добра вывучылі свой раён. Можаце вылучыць асаблівасці вашай выбарчай акругі?***

— Так, сапраўды, свой раён я ведаю дасканала, таму што гэта не проста працоўнае месца, а мая малая радзіма. Я нарадзіўся і вырас у Пінскім раёне, і ўся мая працоўная дзейнасць непарыўна з ім звязана.

Галоўная асаблівасць маёй акругі — яе маштаб і спалучэнне розных тыпаў тэрыторый: сельская глыбінка, аддаленыя вёскі і аграгарадкі, частка горада Пінска. Гэта азначае, што ў адной акрузе жывуць і жыхары шматпавярховых дамоў з гарадскімі праблемамі, і працаўнікі сяла са сваімі паўсядзённымі турботамі. Але менавіта дзякуючы таму, што я ведаю тут кожны метр, мне лягчэй знаходзіць баланс паміж інтарэсамі пінчан і жыхароў раёна.

### АБ НАБАЛЕЛЫМ

***— Што больш за ўсё хвалюе вашых выбаршчыкаў?***

— Больш за ўсё сёння жыхароў маёй акругі хвалююць дзве тэмы: дарогі і жыллёва-камунальная гаспадарка. Гэта не проста назіранні, а рэальная тэндэнцыя, якую пацвярджае лічбавая

на месцах — гэта не проста абавязак, а галоўны інструмент работы.

### І АБАРОНЦА, І ПАМОЧНІК

***— Якімі ж якасцямі павінен валодаць сапраўдны дэпутат?***

— Я лічу, што дэпутат павінен быць добрасумленным, адказным і ўмець унікаць у чужую бяду. Нельга вырашыць праблему, калі ты не зразумееў яе глыбіні. Таму я стараюся кожны дзень нагадваць сабе, што людзям патрэбны не твае словы, а твае справы. А справы робяцца толькі тады, калі ты па-сапраўднаму паглыбляешся ў іх праблемы і нясеш за вынік персанальную адказнасць.

***— На вашу думку, для выбаршчыкаў дэпутат — абаронца ці, хутчэй, памочнік у пошуку правільнага выйсця?***

— Дэпутат павінен спалучаць абедзве ролі. Спачатку дапамагчы вырашыць канкрэтную праблему чалавека, але калі сістэма дае збой — стаць абаронцам інтарэсаў выбаршчыкаў перад дзяржаўнымі структурамі.

### КОМПЛЕКСНЫ ПАДЫХОД

***— Чым вашай акрузе запомніўся Год добраўпарадкавання?***

— Гэты год стаў часам рэальных змен, якія ўбачылі і адчулі ўсе жыхары. Галоўнае, чым ён запомніўся, — комплексны падыход. Гэта не прос-

краіны ў цэлым. Таму мая задача — не проста сказаць ім словы ўдзячнасці, а зрабіць усё, каб іх праца была паважанай, а жыццё — годным.

### ПЯЦЬ ПРЫНЦЫПАЎ

***— Якім прынцыпам кіруецеся ў сваёй рабоце?***

— Кіруюся некалькімі ключавымі прынцыпамі.

Па-першае, гэта ўважлівасць да людзей і абарона іх інтарэсаў — бо менавіта дзеля гэтага я тут.

Па-другое — добрасумленнасць, адказнасць і мэтанакіраванасць у дасягненні выніку: калі ўзяўся за справу, давяду яе да канца.

Па-трэцяе — адкрытасць, даступнасць і аператыўнасць: выбаршчык павінен ведаць, што яго пачуюць адразу, а не праз тыдзень.

Па-чацвёртае — узаемадзеянне з мясцовымі органамі ўлады. Без канструктыўнага дыялогу з райвыканкамам, гарвыканкамам і сельсаветамі немагчыма вырашыць ніводную сур'ёзную праблему.

І пятае — падсправаздачнасць. Лічу

шых выбаршчыкаў?

— Больш за ўсё сёння жыхароў маёй акругі хвалююць дзве тэмы: дарогі і жыллёва-камунальная гаспадарка. Гэта не проста назіранні, а рэальная тэндэнцыя, якую пацвярджае лічбавая статыстыка — па гэтых двух кірунках самая вялікая колькасць зваротаў.

## НЕ «ЧЫНОЎНІК З ПАПЕРКАЙ», А ЖЫВЫ ЧАЛАВЕК

***— Якія формы ўзаемадзеяння са сваімі выбаршчыкамі лічыце найбольш эфектыўнымі?***

— Самай эфектыўнай формай узаемадзеяння лічу асабістыя зносіны. Калі чалавек прыходзіць да дэпутата, ён прыносіць не проста словы, а свой боль, страх або надзею. Праз тэлефон ці паперу нельга перадаць усе нюансы сітуацыі. Жывы дыялог дазваляе не толькі пачуць праблему, але і адразу знайсці пункты судакранання: патлумачыць, чаму нешта пакуль немагчыма зрабіць, або наадварот — адразу ўзяць на кантроль.

Акрамя таго, асабістая сустрэча будуе давер. Калі выбаршчык бачыць перад сабой не «чыноўніка з паперкай», а жывога чалавека, які вырас у тым жа раёне і разумее яго праблемы, з'яўляецца жаданне супрацоўнічаць, а не канфліктаваць. Таму для мяне рэгулярныя прыёмы грамадзян і выязныя сустрэчы

***— Чым вашай акрузе запомніўся Год добраўпарадкавання?***

— Гэты год стаў часам рэальных змен, якія ўбачылі і адчулі ўсе жыхары. Галоўнае, чым ён запомніўся, — комплексны падыход. Гэта не проста «пафарбавалі лаўкі», а сістэмнае прывядзенне ў парадак тэрыторый — пачынаючы з дзіцячай пляцоўкі і заканчваючы сацыяльнымі аб'ектамі, паркам. І самым галоўным вынікам стала не колькасць пафарбаваных агароджаў, а тое, што людзі самі пачалі больш клапаціцца пра свае двары. Гэта і ёсць галоўная мэта любога добраўпарадкавання.

## АСАБЛІВАЯ ЎВАГА — ПРАЦАЎНІЦАМ СЯЛА

***— Што робіцца для жыхароў вашай акругі ў Год беларускай жанчыны?***

— Сам па сабе Год беларускай жанчыны — гэта выдатны маркёр, але клапаціцца пра жанчын трэба заўсёды. Таму акцэнт раблю не на колькасць мерапрыемстваў, а на іх сэнс. Як член Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы я лічу сваім абавязкам удзяляць асаблівую ўвагу працаўніцам сяла. Менавіта яны трымаюць на сабе нашу аграрную Піншчыну: працуюць у полі, на фермах, у перапрацоўчай прамысловасці. І пры гэтым застаюцца моцным тылам для сваіх сем'яў і для ўсёй

мясцовымі органамі ўлады. Без канструктыўнага дыялогу з райвыканкамам, гарвыканкамам і сельсаветамі немагчыма вырашыць ніводную сур'ёзную праблему.

І пятае — падсправаздачнасць. Лічу сваім абавязкам рэгулярна інфармаваць выбаршчыкаў аб сваёй дзейнасці, а таксама тлумачыць, якія законы прымаюцца і як яны паўплываюць на іх жыццё. Людзі маюць права ведаць, чым займаецца іх дэпутат.

## ТОЛЬКІ РАЗАМ!

***— Што вы пажадалі б сваім выбаршчыкам?***

— У першую чаргу я жадаю сваім выбаршчыкам мірнага неба, моцнага здароўя і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні! Гэта самае галоўнае, без чаго немагчыма нішто астатняе.

А калі казаць пра нашу родную Піншчыну, то жадаю, каб наш агульны дом развіваўся і квітнеў, станавіўся яшчэ прыгажэйшым і лепшым. Каб кожны куток нашай акругі — ад маленькай вёсачкі да вялікага Пінска — быў дагледжаным, утульным і такім, дзе хочацца жыць, радавацца і расціць дзяцей. Бо толькі разам, клапоцячыся пра сваю зямлю, мы зробім нашу Піншчыну сапраўды найлепшым месцам на зямлі.

**Надзея ЗУЕВА**
**Фота з асабістага архіва дэпутата**